# Журналістыка

Т.У.ПАДАЛЯК

## АСВЯТЛЕННЕ ТЭМЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ У БЕЛАРУСКАЙ ПРЭСЕ ПОСТПЕРАБУДОВАЧНАГА ПЕРЫЯДУ

Пра Вялікую Айчынную вайну шмат напісана і знята фільмаў, але разам з тым многае недасказана, прыхарошана ці проста забыта. У 90-я гг. з'явілася магчымасць прааналізаваць дакументальныя крыніцы, што дзесяцігоддзямі хаваліся ў папках з грыфам "сакрэтна". Грамадства імкнецца да праўды, аднак не можа не бянтэжыць, што ў высакародным парыве сказаць *усё* ўвага засяроджваецца пераважна на "белых плямах" і памылках. У выніку непрыметна губляецца відавочнае; да таго, што было вядома раней, грамадства ставіцца з падазрэннем і недаверам. Атрымліваецца: у жаданні высветліць *усю праўду* мы яшчэ далей адыходзім ад ісціны, разам з вадой выплюхваем і дзіця, паколькі самая галоўная праўда вайны – подзвіг народа, які не скарыўся, выратаваў ад фашысцкай навалы сваю краіну і ўвесь свет, а потым узняў радзіму з руін і попелу. Пра гэта – галоўнае – часам забываюць журналісты.

У пасляваенныя дзесяцігоддзі і ў айчыннай гістарыяграфіі, і ў журналістыцы панавала аблегчанае адлюстраванне вайны. Пралікаў было нямала, і ўсё ж яны тлумачацца не толькі зручным канцэптуальным схематызмам партыйных патрабаванняў да паэтызацыі народнай барацьбы супраць фашызму (як прынята лічыць у постперабудовачны час). Даўно заўважана: калі чалавеку нешта баліць, дык ён нават болю не адчувае – ад нясцерпнага, невыноснага болю. Гэтую спецыфічную асаблівасць даследаваў сусветна вядомы спецыяліст па пытаннях псіхалогіі асобы В.Франкл,назіраючы праяўленні "экзістэнцыяльнага вакууму" пасля перанесенага чалавекам шоку[1]. Штосьці падобнае здарылася з нашым грамадствам адразу пасля вайны. Перамогу, святую барацьбу народную ператварылі ў зручныя фетышы. З вышыні часу можна з папрокам гаварыць пра святочна-тэатральнае напаўненне лозунга "Ніхто не забыты", пра "няправільныя" пасляваенныя кінафільмы, аповесці і апавяданні, пра "немастацкія" абеліскі на брацкіх магілах. Усё дакладна – і ў той жа час не зусім дакладна. Справа не толькі і не столькі ў пануючай "заганнай ідэалогіі", але і ў псіхалогіі канкрэтнага чалавека: балела так моцна, што людзі не адчувалі болю. Нельга не ўлічваць гэтага пры сур'ёзным, сумленным публіцыстычным даследаванні.

З кардынальна новымі ацэнкамі мінулай вайны ў 1992 г. у штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" выступіў В.Акудовіч. У артыкуле "Вялікая Айчынная ці другая сусветная?" ён абвясціў, што для Беларусі вайна 1941–1945 гг. не была Вялікай Айчыннай і растлумачыў гэта няздольнасцю беларусаў да ваеннай барацьбы нават за сваю родную зямлю: "Асабіста я схільны лічыць, што ідэя змагання з акупантамі не беларускага паходжання. Як на маё разуменне, дык у праекцыі на беларусаў яна не мае гістарычна пацверджанага генезісу". Аўтар сцвярджае, што "для нас і для Расіі гэта былі дзве зусім розныя вайны"[2]. Як уявіць гэта ў рэальнасці? Беларусь мела свой фронт, Расія – свой? У Беларусі свая мэта ў вайне, у Расіі – свая? Не, і фронт быў

агульным, і мэта: вайна несла агульную пагрозу знішчэння. Вывады аўтара штотыднёвіка не пацвярджаюцца факталагічна. Відавочна: характар публікацыі вызначаўся загадзя абранай "пазіцыяй", пэўнай устаноўкай.

Вялікую і неадназначную прэсу мела кніга польскага даследчыка Ю.Туронка "Беларусь пад нямецкай акупацыяй", якая ўтрымлівае не толькі новыя факты, але і новыя інтэрпрэтацыі вядомых падзей, нечаканыя вывады і абагульненні. Аналізуючы гэту кнігу ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва", М.Віж сцвярджае: "Другая сусветная вайна для беларусаў яшчэ застаецца невядомай вайной!". Ужо сама назва вайны "невядомай" – выклікае непаразуменне. "Невядомыя старонкі" мінулай вайны могуць быць, але "невядомая вайна"? Ці можна так гаварыць пра вайну, якая ўшчэнт разбурыла Беларусь, забрала чацвёртую частку яе насельніцтва?.. Аўтар сцвярджае, што агульная сітуацыя на Беларусі "вельмі нагадвала грамадзянскую вайну і нэ ўкладвалася ў рамкі класічнага ўзору "акупанты – акупаваныя"[3]. Для пэўнай "пазіцыі", безумоўна, вельмі зручна разглядваць падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі не як барацьбу з акупантам, а як грамадзянскую вайну – увасабленне звычайнага процістаяння дзвюх сістэм па схеме "камуністы – нацыяналісты, Гітлер – Сталін", быццам бы ў вайну не было ўцягнута мноства іншых краін. Зноў відавочнае імкненне ўкласці мінулае ў межы новага ідэалагічнага "пракрустава ложа". Аднак вытокі масавага народнага супраціўлення акупантам любы сумленны даследчык зможа ўважліва і дакладна прасачыць, калі без пафасу і эмоцый узгадае: нацысцкая палітыка ажыццяўлялася пад лозунгам "прастора без народа", які абумовіў і даў тэарэтычнае абгрунтаванне знішчэнню "ніжэйшых рас". З першых дзён фашысцкай навалы пачаў ажыццяўляцца жудасны па сваёй задуме генеральны план "Ост", які прадугледжваў знішчэнне 120–140 мільёнаў карэннага насельніцтва Савецкага Саюза з далейшым засяленнем "вызваленых" тэрыторый немцамі. Нейкі асаблівы лёс беларусаў не чакаў: Беларусь успрымалася не інакш, як будучая калонія. З нямецкім педантызмам было падлічана, колькі неабходна пакінуць насельніцтва, каб забяспечыць сабе бесклапотнае існаванне на акупіраванай тэрыторыі, – 75% жыхароў рэспублікі падлягала так званаму "высяленню", пад якім мелася на ўвазе фізічнае знішчэнне "недачалавекаў".

У рэчышчы гэтых, стаўшых ужо хрэстаматыйнымі, фактаў зусім незразумела, чаму не пазбегнуў крайнасцей і выдатны беларускі пісьменнік Васіль Быкаў, які сваімі ваеннымі аповесцямі 60–80-х гг. стварыў сапраўдны абеліск мужнасці і сіле духу чалавека-патрыёта. У артыкуле "Горкі смак Перамогі", змешчаным у "Народнай газеце", В.Быкаў піша пра "другую праўду" вайны: маўляў, у Беларусі вайна была не толькі Айчыннай, але і грамадзянскай, ініцыіраванай бальшавікамі. Аднак ці магчыма выявіць гістарычныя аналагі, каб вайна ў краіне, якую акупіравала армія чужынцаў з адзінай мэтай – захапіць яе тэрыторыю, багацці, зняволіць яе народ, усталяваць свае парадкі, – каб такая вайна лічылася грамадзянскай? Той факт, што ветэраны не пагаджаюцца з выказваемай "другой праўдай", пісьменнік тлумачыць наступным: "ветэраны старэюць, і шмат якія іхнія заганы маюць, безумоўна, біялагічную прыроду. Зноў жа большасць з іх, як ужо сказана, – несумненны прадукт камуністычнага выхавання і ягонай фальшывай ідэалогіі... За паўстагоддзя натуральна аслабла іхняя памяць, яны лёгка забываюцца на сябе колішніх і ахвотна набываюць рамантызаваны, "падвышаны" вобраз герояў, да непрыстойнасці ўвешаных т.зв. урадавымі ўзнагародамі, амаль спрэс пасляваеннага паходжання. Зрэшты, па-чалавечы тое можна і зразумець – каму не хочацца выглядаць прыгожа! Але ў цывілізаваным грамадстве таго прынята саромецца. Ды не ў нас"[4]. Па-першае, заўвагі наконт таго, што заганы ветэранаў маюць "біялагічную прыроду" і "аслабла іхняя памяць" б'юць рыкашэтам па самім аўтару: ён жа належыць акурат да пакалення, у якое кідае каменне. Па-другое, у якім "цывілізаваным свеце" ёсць аналаг нашай гісторыі, вызваленне Айчыны ад ворага і перамога над фашызмам, – дык чаго саромецца ветэранам?

Выклікаюць непаразуменне памкненні некаторых журналістаў і гісторыкаў абяліць, узвысіць і ўвогуле "перапісаць" вобраз гаўляйтэра Вільгельма Кубэ: маўляў, адораны паэт Кубэ не мог быць "катам беларускага народа", ён

выступаў супраць праследаванняў яўрэяў, падтрымліваў беларускую нацыянальную ідэю[5]. Аднак Кубэ ўвасабляў фашысцкі рэжым, не выканаць свайго прызначэння ён не мог: гэта быў пераканаваны нацыст, давераны чалавек фюрэра, інакш бы ў Беларусь, на цэнтральны ваенны напрамак, яго не прызначылі. Газета "Звязда", палемізуючы з "перапісчыкамі гісторыі", удакладніла, што захавалася мноства дакументаў, якія сведчаць: Кубэ зусім не быў абаронцам яўрэяў, а хутчэй наадварот. У мінскім гета, напрыклад, было яшчэ і ўнутранае гета для прывазных яўрэяў з Чэхаславакіі, Польшчы, Германіі: Беларусь стала палігонам па знішчэнню яўрэяў, і Кубэ рэгуляваў гэту злачынную працэдуру[6].

Варта прызнаць, што многім беларускім нацыяналістам сапраўды былі ўласцівыя надзеі на вайну як на спосаб вырашэння нацыянальнага пытання. Гэтыя надзеі былі не толькі амаральнымі, але і наіўнымі ў сваёй накіраванасці на пабудову нацыянальнага раю, фундаментам якога павінен быў стаць апафеоз народнай трагедыі, апафеоз вайны. Таму журналістам, якія прыхільна ставяцца да падобных ідэалагічных канцэпцый, трэба было б задумацца: ці варта пляскаць у ладкі парасткам беларушчыны ваеннага часу? Трагедыя самападману: ці магчыма была незалежнасць пад патранажам Германіі? Фашысты прыйшлі на нашу зямлю са сваёй нацыянальнай ідэяй – нацысцкай; іх менш за ўсё турбавала беларускасць. Дый, прынамсі, што такое "нацыянальная ідэя" без народа?.. Мэты вайны фашысты не хавалі пад нацыянальнымі праблемамі: яны ставілі іх на парадак дня, каб утрымаць захопленыя тэрыторыі, а для гэтага стараліся "сутыкнуць ілбамі" суседнія народы. Мінск быў беларускім, а "па-суседству, у Магілёўскай, Віцебскай, часткова Гомельскай абласцях усяляк заахвочваўся рускі нацыяналізм"[7]. Фашысты выкарыстоўвалі нацыянальнае пытанне толькі ў сувязі з перспектыўнымі інтарэсамі Германіі ў Беларусі. У прывітальным лісце часопісу "Жыве Беларусь!" В.Кубэ выклаў сваё бачанне духоўных і ідэйных установак беларускай моладзі: нянавісць да бальшавізма і яўрэйства, вернасць Германіі і Гітлеру, любоў да сваёй Радзімы і беларускага народа. А для "ўнутранага карыстання" меліся наступныя тлумачэнні: "Нідзе не трэба адмаўляцца ад ярка выражанага нацыяналізму, а калі ён на нашу карысць, то нават распальваць яго. У наступныя гады для нас ён не будзе ўяўляць небяспекі, а пасля таго, як будзе дасягнута перамога, мы станем дастаткова моцнымі, каб справіцца з ім"[8].

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі, апроч вайсковых і паліцэйскіх фарміраванняў з мясцовага насельніцтва, дзейнічалі і цывільныя арганізацыі. Да такіх адносіцца Саюз беларускай моладзі (СБМ) – дзейнасць гэтай арганізацыі некаторымі аўтарамі падаецца ў перыядычным друку як сведчанне клопату фашысцкіх акупантаў пра развіццё дэмакратыі і культуры і нават падтрымкі ў барацьбе за незалежнасць Беларусі. У штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" (рубрыка "Беларускае замежжа: жывыя галасы") надрукавана інтэрв'ю з жыхаром ЗША Міхасём Сеньдам, які ў вайну быў членам Саюза беларускай моладзі, Беларускай Краёвай Абароны. Публікацыя ўтрымлівае наступнае прызнанне: "Мы не думалі, што пад немцамі беларусы могуць стаць незалежнымі. Але мы хацелі выкарыстаць шанц для ўмацавання беларускай свядомасці, каб падрыхтаваць новыя беларускія кадры, якія б не былі папіханцамі чужынцаў, якія б былі вольнымі і мелі свой нацыянальны гонар..." М.Сенька расказвае, што беларускія жаўнеры насілі "чорную нямецкую форму. Зброя была італьянская. Мы прысягалі, што будзем <u>ваяваць</u> (падкрэслена мной – Т.П.) толькі на тэрыторыі Беларусі"[9]. Але – з кім ваяваць на тэрыторыі Беларусі? З беларускім народам? Гэтага былы суайчыннік не ўдакладняе, а журналіст (ён чамусьці не падпісаў інтэрв'ю) не задае адпаведнага пытання.

Саюз беларускай моладзі быў арганізаваны па ўзору Гітлерюгенда, а члены СБМ насілі форму Гітлерюгенда. Моладзь гэтай арганізацыі падманулі прывіднай ідэяй новай Беларусі. Можна ўпэўнена сказаць, што большая частка гэтай моладзі не была дасведчана ў намерах фашыстаў сцерці Беларусь з твару зямлі. Ці ёсць падставы ўзводзіць гэтую памылку часткі беларускай моладзі перыяду фашысцкай акупацыі у ранг падзеі вялікай гістарычнай важнасці і ўрачыста адзначаць угодкі яе стварэння, як гэта было

зроблена ў чэрвені 1992 г. па ініцыятыве Беларускага народнага фронта (БНФ)? Неабходна ўзважаная ацэнка гістарычных падзей. Адбыўся Нюрнбергскі працэс, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый асудзіла фашысцкія арганізацыі як антычалавечыя, надрукаваны матэрыялы, што выдаюць фашысцкія планы і мэты захопу чужых зямель, у тым ліку і беларускай.

Газета "Звязда" часта расказвае пра беларусаў замежжа. Пасля некаторых публікацый рэдакцыя атрымлівае пісьмы (бывае, і калектыўныя) з папрокамі: маўляў, чалавек у вайну паліцаем быў, столькі гора прычыніў аднавяскоўцам, нездарма збег у 44-м, а газета яго ў героі цягне... Не жаданне адпомсціць – імкненне расставіць кропкі над "і" рухае аўтарамі пісьмаў у рэдакцыю. Памяць людская, у адрозненне ад юрыспрудэнцыі, не ведае "тэрмінаў даўнасці". 6 ліпеня 1993 г. "Звязда" надрукавала інтэрв'ю Л.Пранчака з прэзідэнтам беларуска-амерыканскага цэнтра ў Саўт-Рыверы (ЗША) Юркам Навумчыкам. У публікацыі падрабязна апавядаецца пра бацьку Юркі Івана (Янека) Навумчыка, удзельніка Слуцкага паўстання, а пазней – каменданта паліцыі ў вёсцы Заастравечча Клецкага раёна. Публікацыя мела вялікі рэзананс у Клецкім раёне, пра што сведчыць артыкул У.Карачуна "Народ памятае, хто быў ахвярай, а хто катам". У прыватнасці, землякі Юркі Навумчыка абурыліся наступнай яго заявай: "Вайна паламала лёсы нашых бацькоў. І яны вымушаны былі пакінуць сваю радзіму. Але мы ведаем, што яны працавалі для Беларусі – і пры немцах, і пры палякак"[10]. Аднак у памяці вяскоўцаў Навумчык "застаўся хітрым ворагам мясцовых партызанаў, актыўным удзельнікам яўрэйскіх пагромаў, марадзёрам без сораму і сумлення"[11]. Жывыя сведкі ваенных падзей узгадваюць шэраг злачынстваў, здзейсненых Навумчыкам, і выказваюць здзіўленне, што журналіст зусім не падвяргае пачутае сумненню. Увогуле можна зразумець сына, якому неабыякавая памяць пра бацьку, але як зразумець журналіста, які ўжо з прычыны сваёй прафесіі абавязаны быць аб'ектыўным?

Многія калабарацыяністы сваё супрацоўніцтва з акупантамі тлумачаць помстай за сталінскія рэпрэсіі. Аднак Радзіму нельга атаясамліваць з уладай, і Курапаты – злачынства *перад Радзімай*, а не злачынства Радзімы. Усякія тлумачэнні, чаму "мсціўцы" паварочвалі зброю супраць суграмадзян, амаральныя па сутнасці сваёй. Трагічныя падзеі, якія адбываліся ў СССР у перадваенныя гады (масавыя арышты, высылкі, расстрэлы), балюча закранулі многіх грамадзян Беларусі, аднак пытанне, куды страляць – у акупанта ці суайчынніка, – паўставала далёка не перад усімі.

Настаў час прымірэння людзей, якія ваявалі па розныя бакі барыкад. Аднак, адмаўляючыся ад шаблонаў сталінскай прапаганды, якая агулам называла "здраднікамі і ворагамі народа" ўсіх грамадзян, якія па жаданню ці міжволі супрацоўнічалі з акупантамі, нельга кідацца ў іншую крайнасць – абвяшчаць гэтых людзей ледзь не барацьбітамі за народнае шчасце. Супрацоўніцтва з ворагам адбывалася на фоне жудасных фашысцкіх злачынстваў, крыві народнай. Ці можна лічыць ворага сябрам, калі так пакутуе твой народ? У штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" І.Дуброўскі піша: "Ствараецца ўражанне, што пераацэнка вайны ідзе па загадзя вызначаным плане – абяліць, апраўдаць акупантаў і іхніх прыспешнікаў за бесчалавечныя ўчынкі. Усю віну за зверствы гітлераўцаў зваліць на партызан"[12].

Пачынаючы з 1992–1993 гг. у друку ўсё больш упэўнена нарастае хваля пераацэнкі партызанскага руху на Беларусі. На думку доктара філасофскіх навук, былога начальніка штаба атрада 2-й Заслонаўскай брыгады М.Крукоўскага, "можна сустрэць часам ацэнку гэтага супраціўлення, амаль поўнасцю супадаючую з ацэнкамі, што даваліся яму нямецка-фашысцкімі акупантамі"[13]. Новы ўзлёт спрэчак пра партызанскі рух выклікала інтэрв'ю С.Алексіевіч, апублікаванае ў газеце "Известия" 29 лютага 1996 г. Пісьменніца, у прыватнасці, сцвярджае: "Мы вось зусім не ведаем, якая страшная была партызанская вайна. На ёй уладарыў маленькі князёк... Партызанскі атрад – гэта ў прынцыпе добрая банда"[14]. У "Народнай газеце" 27 сакавіка 1996 г. быў змешчаны ліст камісіі пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Беларусі, дзе размова вядзецца пра грамадзянскую прыстойнасць і маральнасць пісьменніцы, якая агулам абвінавацiла ўсіх абаронцаў радзімы як насільнікаў

і начных рабаўнікоў. Пазней газета змясціла інтэрв'ю са Святланай Алексіевіч, дзе пісьменніца, параўноўваючы сябе з Дастаеўскім (маўляў, яго таксама абвінавачвалі, што сваім героем зрабіў нейкага вар'ята Раскольнікава), сцвярджае: "Сёння важна гаварыць не толькі пра цану Перамогі, яе веліч, але і пра біялагічную прыроду чалавека ў час вайны – менавіта з гэтага пункту гледжання мы не ведаем усёй праўды пра вайну, тым больш пра партызанскую вайну на Беларусі"[15]. У наяўнасці – падмена паняццяў: Дастаеўскі, як і большасць пісьменнікаў-гуманістаў, даследаваў зусім не "біялагічную прыроду" чалавека, а духоўную, душэўную – імкнучыся спасцігнуць, што ж робіць чалавека чалавекам, чаму нават у "пагранічнай сітуацыі" дух перамагае плоць і г.д. ("біялагічную прыроду" чалавека даследуюць біёлагі, фізіёлагі, дыетолагі...). Інтэрв'ю пісьменніцы, змешчанае ў "Народнай газеце", таксама выклікала шквал чытацкіх пісьмаў, некаторыя з якіх былі апублікаваны 7 мая 1996 г. Ветэраны ўзгадваюць, што ў кнізе "У вайны не жаночае аблічча" С.Алексіевіч пісала прама процілеглае сваім апошнім выказванням.

Мы далёкія ад таго, каб ідэалізаваць усіх, хто пайшоў у партызаны: сітуацыі складваліся самыя розныя. Але, аналізуючы вайну, нельга пераходзіць на персаналіі, асобныя факты ўзводзіць у ранг заканамернасці. Таму што 400-тысячная армія партызан, сілаю "абіраючы" сялян, не магла б не тое што змагацца – існаваць. Без актыўнай падтрымкі насельніцтва партызанская барацьба не стала б рэальнасцю на Беларусі. Не варта таксама забываць, што партызанская вайна – гэта барацьба і гібель людзей, якія не атрымлівалі загаду ваяваць; гэта была вайна добраахвотнікаў. Менавіта за стойкае партызанскае супраціўленне фашысцкім акупантам Беларусь, не будучы суверэннай дзяржавай, была прынята ў якасці правадзейнага члена ў склад Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Названыя пераацэнкі падзей Вялікай Айчыннай вайны ўвогуле можна было б аднесці да "сенсацыйна-смелых" крокаў у накірунку праўдашукальніцтва, калі б не адна акалічнасць: большасць "навацый" з'яўляецца не арыгінальным даследам гісторыі, а пераказам публікацый акупацыйнага друку. Гісторык С.Жумар дэтальна прааналізаваў асноўную тэматыку беларускамоўнага прафашысцкага друку Беларусі ў 1941–1944 гг. Акупацыйныя газеты (дарэчы, яны былі цалкам падцэнзурныя, падкантрольныя фашысцкім уладам) заклікалі супрацоўнічаць з гітлераўцамі, змагацца з "бандытамі" – партызанамі і падпольшчыкамі. Абгрунтоўвалася правамернасць вынішчэння яўрэйскага народа – так, "Менская газета" пісала, што "інтарэсы жыдоў і нежыдоў несумяшчальныя, жыдоўская этыка і мараль не павінны атручваць іншыя нацыі,.. жыдам наогул няма месца сярод нас!"[16]. Друкаваліся "навуковыя" матэрыялы, якія павінны былі сведчыць, быццам Беларусь на працягу ўсяе гісторыі імкнулася пад патранаж Германіі. Змяшчалася ў прэсе нямала і палітычна-нейтральных матэрыялаў (традыцыі, звычаі, культура беларусаў). Аднак супрацоўнікі прафашысцкіх выданняў прынеслі нацыянальнаму адраджэнню больш шкоды, чым карысці: яны цесна ўвязвалі беларускую ідэю з фашысцкай.

Такім чынам, "новыя" погляды на гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пры пільным іх вывучэнні аказваюцца ў пераважнай большасці зусім не новымі і тым больш – не арыгінальнымі. Неабходна ўважліва ўглядацца ў стаўшыя гісторыяй падзеі, бо яны маюць жывое сучаснае гучанне. Патрыятызм (любоў да Айчыны, адданасць ёй, імкненне служыць яе інтарэсам) правамерна разглядаць як паказчык духоўнасці і грамадства, і асобы. Менавіта таму скажэнне праўды ў публікацыях пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны аказвае небяспечны ўплыў на фарміраванне светапоглядных арыентацый чытацкай аўдыторыі.

[1] Франкл В. Человек в поисках смысла. М., 1990. С.221–222.

[2] Акудовіч В. Вялікая Айчынная ці Другая сусветная? // Літаратура і мастацтва. 1992. 26 чэрв. С.5.

[3] Віж М. Невядомыя старонкі "невядомай вайны" // Літаратура і мастацтва. 1994. 14 студз. С.14.

[4] Быкаў В. Горкі смак Перамогі // Народная газета. 1995. 7 сак. С.3.

[5] Гл.: Віж М. Назв. арт.

[6] Чарнаглазава Р. У кожнага – свая жыццёвая праўда... // Звязда. 1993. 3 ліпеня. С.2.
[7] Там жа.
[8] Жумарь С.В. Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны (на материалах белорусскоязычных изданий): Дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1995. С.83.
[9] Сенька М. Дасць Бог, і Беларусь будзе квітнеючай краінай // Літаратура і мастацтва. 1993. 29 мая. С.14.
[10] Навумчык Ю. Падтрымліваць беларускае жыццё ў Амерыцы з кожным годам становіцца цяжэй // Звязда. 1993. 6 ліпеня. С.2.
[11] Гл.: Карачун У. Народ памятае, хто быў ахвярай, а хто катам // Звязда. 1993. 28 жніўня. С.3.
[12] Дуброўскі І. Паклаўшы руку на Біблію // Літаратура і мастацтва. 1994. 6 мая. С.5, 13.
[13] Крукоўскі М. "Партызаны, партызаны – беларускія сыны..." // Літаратура і мастацтва. 1994. 24 чэрвеня. С. 5, 12.
[14] Алексиевич С. Нас так долго учили любить человека с ружьем // Известия. 1996. 29 февраля. С.5.
[15] Алексіевіч С. Я – не писатель катастроф. Просто жизнь вокруг нас катастрофична до бессмысленности // Народная газета. 1996. 13 красавіка. С.7.
[16] Жумарь С.В. Назв. праца. С.102.

*А.І.САЛАЎЁЎ*

## КІБЕРНЕТЫЧНЫ ПАДЫХОД У ДАСЛЕДАВАННІ ГЕЙТКІПЕРСТВА

Праблема дыфузіі і распаўсюджвання інфармацыі ў якасці адметных элементаў сістэмы масавай камунікацыі ў грамадстве ўяўляе сабой адзін з важнейшых бакоў у гэтай сістэме. І тут, напэўна, не абысціся без разважанняў наконт гейткіпера і яго ролі ў адборы інфармацыйных паведамленняў для распаўсюджвання і масавага тыражыравання.

Паняцце гейткіпера ў дачыненні да мас-камунікацыйнага даследавання было ўведзена некалькі дзесяткаў гадоў таму амерыканскімі вучонымі. Літаральны пераклад англійскага слова gatekeeper азначае "брамнік". У традыцыйным разуменні "брамнік" адчыняе і зачыняе вароты. Гейткіпер таксама валодае своеасаблівымі "варотамі", якія ён то адчыняе, калі "прапускае" нейкую інфармацыю для публікацыі, для перадачы ў радыё- ці тэлеэфір, то зачыняе, калі інфармацыйныя паведамленні не прызначаны для масавага чытача, слухача ці гледача і трапляюць у нейкі сімвалічны кошык для смецця.

Хто ён такі, гэты функцыянер з моцнай пазіцыяй, калі ён не цэнзар?.. А ён *не цэнзар*, таму што мы даследуем сістэму функцыяніравання масавай камунікацыі ў свабодным, дэмакратычным грамадстве. І хоць гісторыя даследавання гейткіпера ўжо набліжаецца да паўвекавога юбілею, прадмет вывучэння, як і раней, настолькі прыцягальны, што ў шэрагу значных навуковых і сацыялагічных часопісаў па масавай камунікацыі (маецца на ўвазе перш за ўсё далёкае замежжа) штогод публікуецца па гейткіперству вялікая колькасць рознааспектных навуковых трактатаў.

Традыцыйнае даследаванне праблемы гейткіпера звычайна вылучае тры асноўныя напрамкі вывучэння: а) праз індывідуаліcцкую ўстаноўку; б) праз інстытуцыянальную ці бюракратычную залежнасць; в) з пункту гледжання кібернетычнага падыходу.

Апошні спосаб даследавання найбольш цікавы. Вучоныя, якія распрацавалі метадалогію кібернетычнага аналізу змяненняў у комплексных сацыяльных арганізацыях, зрабілі пэўнае нечаканае адкрыццё па праблематыцы грамадскай камунікацыі: звяртанне да кібернетычнага падыходу павінна прадугледжваць уменне і здольнасць трымаць пульс на працэсах хутказменлівых абставін знешняга асяроддзя.

Гэтая канцэпцыя разглядае інфармацыйны адбор як *нейкую стабілізуючую схему дзеянняў*, з дапамогай якой група журналістаў праз адпаведныя акцыі апрацоўкі рэагуе на "сыры" інфармацыйны матэрыял.

Лагічны аналіз селекцыі паведамленняў фактычна вылучае некалькі састаўных частак цэласнага працэсу.

На першым этапе інфармацыйнага адбору зацвярджаюцца фармальныя рамкі, фактычныя асновы ўжывання матэрыялаў: *штодзённа "запатрабуецца" дастаткова абмежаваная, вызначаная колькасць слоў ці, хутчэй, паведамленняў, аб'ём якіх не залежыць ад агульнай колькасці адзінак інфармацыі.*